Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 5 (553) | Субота, 8 лютага 1964 г. | Цана 1 кап. | Год выдання XVII-ы

## Пачын гаркаўчан падхопл

Цікавымі і карыснымі справамі сустрэлі зімовыя кані студэнты хімічнага факультэта нашага ўніверсітэта. Па піўшы пачын гаркаўчан—«Студэнт-хімік—паўпрэд у вёсць яны правялі ў гэтыя дні вялікі агітпрабег, мэта якога—пр ганда гістарычных рашэнняў снежаньскага Пленума КПСС. У прабегу прынялі ўдзел студэнты другога і пя курсаў.

Студэнты іншых курсаў чыталі лекцыі па хіміі, дап галі праўленням калгасаў і спецыялістам сельскай гаспад арганізоўваць работу аграгурткоў па месцу жыхарства.

Гэта, так сказаць, першыя крокі ў ажыццяўленні лозунга, які ўзнялі гаркаўчане. Цяпер распрацоўваюцца планы на лета. Мяркуецца, што пяцьдзесят студэнтаў паедуць працаваць на будоўлі вялікай хіміі. Шмат работы будзе ў сёлах і вёсках рэспублікі ў членаў навуковых гурткоў. Дарэчы, такія гурткі функцыяніруюць зараз пры кожнай кафедры факультэта.

## Прыязджайце да нас у Растоў

*Гэтымі днямі ў нашым універсітэце пабывала студэнцкая дэлегацыя Растоўскага-на-Доне дзяржаўнага ўніверсітэта. Група членаў камітэта камсамола і камсамольскіх актывістаў РДУ робіць паездку па маршруту Растоў-на-Доне—Масква — Вільнюс—Мінск—Кіеў — Растоў-на-Доне з мэтаю пазнаёміцца з пастаноўкай работы ў камсамольскіх арганізацыях мясцовых універсітэтаў, падзяліцца вопытам сваёй работы, наведаць гістарычныя мясціны гэтых гарадоў. У гасцях «Беларускага ўніверсітэта» пабываў кіраўнік дэлегацыі, член камітэта ВЛКСМ РДУ Юрый Багачоў.*

Дарагія сябры! Знаёмства з вашай цудоўнай сталіцай, з універсітэтам, яго вучэбнымі карпусамі і інтэрнатамі, сустрэчы ў камітэце камсамола, бібліятэцы, музеях і на кафедрах універсітэта пакінулі ў нас самыя яркія ўспаміны.

Мы зайздросцім вам у лепшым сэнсе гэтага слова. Вашы цудоўныя музеі, актавая зала, чытальныя залы, клуб шашыстаў — ўсё гэта хвалюе і наўрад ці забудзецца.

Праўда, факультэт грамадскіх прафесій у нас працуе ўжо трэці год і працуе лепш. Ён па двухгадовай праграме выпускае лектараў-прапагандыстаў, культмасавікаў, рэжысёраў, журналістаў, бібліятэкараў.

Наша навуковая бібліятэка сумесна з кафедрай рускай літаратуры і камітэтам камсамола праводзяць цікавыя дыспуты, літаратурна-мастацкія вечары, вечары сустрэч з дзеячамі літаратуры і мастацтва, абмеркаванні манаграфій растоўскіх вучоных, агляды новай кніжнай і часопіснай літаратуры.

Ваш горад светлы, чысты, прыгожы, юны. У вас ёсць чым ганарыцца і ва ўніверсітэце. Вы маеце моцны фізічны факультэт, навуковыя кадры, абсталяванне. Мы пазнаёміліся з тэатрамі і кінатэатрамі Мінска, з кінастудыямі, музеямі, паркам імя Чалюскінцаў, з прыгожымі і прасторнымі плошчамі, цудоўнымі дзяўчатамі і юнакамі. Вялізнае ўражанне зрабіў Дом-музей Першага з'езда РСДРП, які ўзнаўляе гістарычныя падзеі. Мы любаваліся горадам з акна вашага ўніверсітэцкага аўтобуса.

Дзякуй вам за сустрэчу, дарагія сябры! За ўвагу, чуласць, клопаты! Нізкі паклон беларускай зямлі.

Да сустрэч у Растове. Прыязджайце да нас. Будзем вельмі рады.

**Юрый БАГАЧОЎ,**
член камітэта ВЛКСМ Растоўскага-на-Доне дзяржуніверсітэта, кіраўнік дэлегацыі.

## Вынікі карпатлівай работы

Студэнты падрыхтоўчага факультэта здалі сваю першую сесію. Яны трымалі экзамен па рускай мове і залікі па матэматыцы і чарчэнню.

Вынікі сесіі паказалі добрую падрыхтоўку замежных студэнтаў. З 78 чалавек добра і выдатна адказвалі на экзамене 55. «Студэнты без слоўніка чыталі незнаёмыя тэксты, пераказвалі іх, выконвалі разнастайныя лексіка-граматычныя заданні, адказвалі на пытанні. Многім прапаноўваліся тэмы для гутарак аб знаходжанні Фідэля Кастра ў СССР, аб Кубе ўчора і сёння, аб Мінску, аб кінафільмах, аб сваім родным горадзе і г. д.»,—гаварыла на пасяджэнні кафедры ў дакладзе па выніках сесіі загадчыца кафедры Т. П. Плешчанка.

Асабліва добра справіліся са здачай экзамена студэнты Маліна Гансалес Агусцін (група выкладчыцы Т. І. Анісімавай), Саса Падрон Марцін (група М. І. Шурын), Самора Гіральт Абунадзіо і Мартэль Абелос Андрэс (група Т. І. Ліпніцкай), Гансалес Касціліо Ульфрэд і Гіхара Эспонда Томас (група А. А. Каковінай), Гера Эрнандэс Анхель (група А. В. Самаль), Бернарда І дэ Сайяс Франциска і Чанг Вальдэс Нельса (група З. Е. Какошынкавай) і іншыя.

Усе студэнты паспяхова здалі і залікі.

**М. МЯЦЕЛЬСКІ,**
метадыст.

## НАШЫ ВЫПУСКНІКІ



*Глафіра Андрэеўна НОВІК, якую вы бачыце на гэтым здымку, скончыла філалагічны факультэт нашага ўніверсітэта ў 1962 годзе. Зараз яна працуе настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў Высокскай сярэдняй школе Бярозаўскага раёна. Яна карыстаецца аўтарытэтам у сваім калектыве, вядзе вялікую грамадскую работу, высока трымае гонар выпускніцы БДУ імя У. І. Леніна.*

### ПАРАДЫ СТАРЭЙШЫХ

## Самы адказны экзамен

Закончылася экзаменацыйная сесія. Пасля напружанай вучобы, хваляванняў студэнты атрымалі некалькі дзён адпачынку — зімовыя канікулы. А цяпер зноў пачынаюцца звычайныя студэнцкія будні.

Але не для ўсіх яны будуць звычайнымі. Студэнты 1 курса аддзялення журналістыкі будуць вучобу спалучаць з практыкай у рэдакцыях шматтыражных газет. Для некаторых гэта будзе першай пробай сіл у сваёй прафесіі, для іншых жа — яшчэ адзін крок у набыцці журналісцкага вопыту. Відаць, хто-ніхто з першакурснікаў палічыць: маўляў, што нам можа даць работа ў шматтыражцы, калі мы ўжо друкаваліся і на старонках рэспубліканскіх газет. Думаць так — памылкова. Для таго, хто сур'ёзна паставіцца да сваіх абавязкаў, работа ў шматтыражцы дасць многае: магчымасць пазнаць вытворчасць, пазнаёміцца з людзьмі, акунуцца, як кажуць, у жыццёвую атмасферу. Апрача таго, праца ў газеце невялікіх памераў вучыць пісаць лаканічна, умела падпарадкоўваючы факты канкрэтнай мэце. Тут для студэнта найбольш зручныя ўмовы авалодаць такімі аператыўнымі жанрамі, як інфармацыя, заметка, інтэрв'ю і рэпартаж. Ёсць магчымасць таксама паспрабаваць «сваё пяро» ў напісанні замалёўкі, фельетона. Словам, пры сур'ёзных адносінах да справы, можна шмат чаму навучыцца.

Мінулагодняя практыка першакурснікаў паказала, што не ўсе студэнты скарысталі першую сур'ёзную магчымасць на шляху авалодання журналісцкім майстэрствам. Былі і такія, што або рэдка заглядалі ў рэдакцыю, або атрымоўвалі заданні і не выконвалі іх. Так ставіліся да практыкі студэнты Зарэцкі, Капыловіч і некаторыя іншыя.

Яшчэ больш адказны экзамен на атрыманне журналісцкай сталасці прадстаіць вытрымаць студэнтам 3 і 4 курсаў аддзялення журналістыкі. Яны ідуць на шматтыднёвую практыку з адрывам ад вучобы, можна сказаць, у вялікі друк — абласныя, рэспубліканскія і іншыя газеты, на радыё і тэлебачанне. Па ўсёй рэспубліцы раз'едуцца нашы выхаванцы. Многія з іх апынуцца ў самых далёкіх кутках краіны — у Новасібірску, Красна-ярску, Калінінградзе, Адэсе, на Сахаліне. Ад таго, як яны будуць працаваць там, залежаць не толькі вынікі іх практыкі, але і гонар універсітэта.

Мінулагодняя практыка паказала, што нашы студэнты ўвогуле ўмеюць берагчы гэты гонар. З розных рэдакцый нашы практыканты прывезлі выдатныя характарыстыкі за добрасумленнасць, стараннасць, паспяховае авалоданне вопытам журналісцкай работы. Так, вельмі задаволены былі практыкай студэнткі Айзенштат работнікі газеты «Молодость Сибири». Як сур'ёзныя, удумлівыя журналісты, праявілі сябе ў час практыкі студэнты Анцыфераў, Кошман, Кукевіч, Кажамякін, Шохан Трукшына, Ісачанка, Калошка, Зарэмба, Асмолаў і многія іншыя.

Былі, на жаль, і такія, што да практыкі паставіліся абыякава, праяўлялі недысцыплінаванасць: Макарэвіч, Куляшоў, Дашчынскі. У выніку — 16 тыдняў прайшлі для іх недастаткова плённа.

Падобныя прыклады сведчаць аб несур'ёзных, безадказных адносінах некаторых студэнтаў да сваёй будучай прафесіі. А яна патрабуе аддачы ўсіх сіл, намаганняў, напружанай і натхнёнай работы. Толькі так можна падрыхтаваць сябе да пачэснай і адказнай пасады — быць падручным партыі ў барацьбе за камунізм.

Тым, хто сёння ідзе на сур'ёзны практычны экзамен, хацелася б пажадаць перш за ўсё патрабавальнасці да сябе і настойлівай журналісцкай вучобы. Вучыцца трэба ўсяму: і ўменню чула і адказна ставіцца да карэспандэнцкіх пісьмаў, не грэбаваць апрацоўваць іх, рыхтаваць да друку, правяраць і дамагацца рэагавання. Менавіта на пісьмах перш за ўсё правяраецца разуменне журналістам свайго грамадзянскага абавязку.

Адказны этап прафесіянальнай вучобы—выезды ў камандзіроўкі. Там пачынаючы журналіст застаецца сам-насам з жыццём. Каб паведаміць людзям праўду, патрэбна не павярхоўнае знаёмства з фактамі, з людзьмі, а дэталёвае вывучэнне іх, патрэбна высокая грамадзянская адказнасць і зацікаўленасць, не гаворачы ўжо аб добрасумленнасці. Здараецца, што пачынаючы журналіст паддаецца першапачатковаму ўражанню, не турбуе сябе ўсебаковым вывучэннем матэрыялу і тады падводзіць і рэдакцыю, і чытача. Верхаглядства трэба выкараняць у самым пачатку журналісцкага шляху.

Хацелася б выказаць яшчэ адну параду. У часе практыкі студэнты звычайна імкнуцца пісаць у розных жанрах — ад заметкі да нарыса і фельетона. Гэта добра, трэба спрабаваць, шукаць. Але, знайшоўшы, варта, на мой погляд, аддаваць перавагу якому-небудзь аднаму жанру і дамагацца ў ім майстэрства. У кожнага журналіста павінен быць свой любімы жанр, у якім ён дасягае найбольшага поспеху. «Мне даводзілася выступаць у розных жанрах, — пісаў М. Кальцоў,— але душу маю запаланіў фельетон».

Жадаю вам, дарагія сябры, вялікіх творчых поспехаў! Вяртайцеся з поўнымі папкамі надрукаваных матэрыялаў.

**Е. Л. БОНДАРАВА,**
дацэнт кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.

## Яшчэ адна кафедра ў нашым універсітэце

У гэтым навучальным годзе ў вышэйшых навучальных установах краіны ўведзена новая дысцыпліна — асновы навуковага камунізма.

Гэтымі днямі ў нашым універсітэце была створана кафедра асноў навуковага камунізма. Загадчыкам новай кафедры стаў кандыдат гістарычных навук Мікалай Рыгоравіч Круцько. У састаў кафедры асноў навуковага камунізма ўвайшлі таксама лепшыя выкладчыкі ўніверсітэта Уладзімір Васільевіч Цакуноў, Анатоль Уладзіміравіч Гусеў, Павел Паўлавіч Селіванчык.

## Звяртаемся да старшакурснікаў

Першы экзамен. Некалькі студэнтаў стаяць ля дзвярэй, але ніхто не адважваецца першым пераступіць парог. Нарэшце, першая чацвёрка знікае за дзвярыма. Астатнія ліхаманкава перагортваюць канспекты, падручнікі. Думкі пераблыталіся, здаецца, нічога не памятаеш.

І вось выходзіць студэнтка. Разгублена разводзіць рукамі: «Двойка!».

Нават адказы наступнай чацвёркі не могуць рассеяць цяжкага настрою. Адзін за адным уваходзяць і выходзяць першакурснікі. Па іх тварах можна чытаць адзнакі, што яны атрымалі: добра, выдатна, здавальняюча, нездавальняюча.

Студэнт дрэнна падрыхтаваўся да экзаменаў — бывае. Пераацаніў свае сілы — таксама бывае. Але бывае і іншае. Рыхтаваўся, шмат рыхтаваўся, а вось зайшоў у аўдыторыю і... ўсё забыў. Той, хто ведаў на «выдатна», адказвае на «добра» і г. д. Мы, першакурснікі, яшчэ не ведаем, як змагацца з такім «шокавым» станам. Будзем вельмі ўдзячныя старшакурснікам, калі яны на старонках нашай універсітэцкай газеты раскажуць, што ім дапамагае пры здачы экзаменаў і што трэба рабіць, каб адказваць у поўную меру сваіх сіл.

**У. ПІХАЛЕНКА,**
студэнт 1 курса завочнага аддз. журналістыкі.

